арфаграфічнага матэрыялу, ступень сфарміраванасці арфаграфічных уменняў і навыкаў, прасачыць тыповыя памылкі вучняў. У кантрольных тэстах адсутнічаюць падказкі, магчымасць звароту да арфаграфічных правіл.

Такім чынам, выкарыстанне апісанага электроннага адукацыйнага рэсурсу па арфаграфіі будзе садзейнічаць фарміраванню, замацаванню арфаграфічных уменняў і навыкаў у вучняў II–IV класаў, а таксама ажыццяўленню кантролю ступені іх сфарміраванасці.

***Літаратура***


*1. Апатова, Н.В. Влияние информационных технологий на содержание и методы обучения в средней школе: автореф. дис. ... д-ра пед. наук: 13.00.02 / Н.В. Апатова; Российская академия образования. Институт общеобразовательной школы. – М., 1994. – 37 с.*

*2. Информационные и коммуникационные технологии в образовании: учеб.-метод. пособие для пед. вузов / И.В. Роберт, С.В. Панюкова, А.А. Кузнецов, А.Ю. Кравцова; под ред. И.В. Роберт. – М.: Институт информатизации РАО, 2006. – 312, [8] с.*

*3. Пальчик, Г.В. Приоритетные направления научных исследований в сфере общего среднего образования в контексте развития информационного общества в Республике Беларусь / Г.В. Пальчик, Л.А. Худенко, В.Ф. Русецкий, О.Е. Лисейчиков, В.З. Сулейманов // Веснік адукацыі. – 2011. – № 12. – С. 3–9.*

*4. Праскаловіч, В.У. Металалогія культуратворчага развіцця вучняў V–XI класаў у працэсе навучання беларускай літаратуры / В.У. Праскаловіч. – Мінск: РІВШ, 2013. – 226 с.*


## БЕЛАРУСКАЯ ЛІНГВІСТЫКА Ў БДПУ: СТОГАДОВЫ ВОПЫТ


*Д.В. Дзятко, БДПУ (Мінск)*


Восенню гэтага года свой 100-гадовы юбілей адзначае Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка – флагман педагагічнай адукацыі нашай краіны. Амаль адразу пасля адкрыцця ў 1914 г. Мінскага настаўніцкага інстытута была распачата падрыхтоўка спецыялістаў у галіне філалогіі. Вялікая заслуга ў развіцці філалагічнай адукацыі, у падрыхтоўцы настаўнікаў школ і сярэдніх спецыяльных устаноў належыць былым дэканам В. Барысенку, І. Зазеку, Л. Сагарову, С. Карабану, М. Гурскаму, В.Тарасаву, А. Бабчынскаму, І. Зяневічу, А. Бардовічу, А. Лугоўскаму, Ф. Шумчыку, а таксама сённяшняму дэкану факультэта В. Старычонку.

Факультэт беларускай і рускай філалогіі, які быў утвораны 6 кастрычніка 2010 г. на аснове факультэта беларускай філалогіі і культуры і факультэта рускай філалогіі, мае багаты вопыт, трывалыя традыцыі і маштабныя планы на будучае. На факультэце працуюць пяць кафедраў: кафедра беларускага мовазнаўства, кафедра беларускай літаратуры і культуры, кафедра агульнага і рускага мовазнаўства, кафедра культуры маўлення і міжкультурных камунікацый і кафедра рускай і зарубежнай літаратуры. Аднак прыярытэтная ўвага, натуральна, надаецца падрыхтоўцы будучых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

Кафедра беларускага мовазнаўства была створана на літаратурна-лінгвістычным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута ў кастрычніку 1931 г. Яе першым загадчыкам (да 1934 г.) і фактычным арганізатарам быў вядомы беларускі і ўкраінскі лінгвіст прафесар Пётр Бузук. У наступныя гады яе ўзначальвалі дацэнты Канстанцін Гурскі (1939 – 1941), Антон Карзон (1944–1949), Ніна Вайтовіч (1949–1956), прафесары Фёдар Янкоўскі (1956–1982) і Міхаіл Яўневіч (1982–1993), дацэнты Павел Міхайлаў (1993–2009) і Дзмітрый Дзятко (з 2009).

Самаадданая праца выкладчыкаў кафедры пакінула прыкметны след у айчынным мовазнаўстве і лінгвадыдактыцы. Сярод яе выпускнікоў – вядомыя беларускія лінгвісты і педагогі: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР акадэмік НАН Беларусі М. Бірыла, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Беларусі член-карэспандэнт НАН Беларусі Ю. Мацкевіч, член-карэспандэнт НАН Беларусі М. Суднік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР доктар філалагічных навук А. Груца, дактары філалагічных навук А. Бахунькоў, Н. Вайтовіч, М. Васілеўскі, М. Гурскі, М. Жыдовіч, В. Ляшчынская, В. Мароз, А. Наркевіч, П. Шуба, дактары педагагічных навук Г. Валочка, Л. Падгайскі, М. Яленскі і многія іншыя.

Зараз на кафедры 13 штатных выкладчыкаў (з іх 12 – кандыдаты навук, дацэнты), якія на 6 факультэтах універсітэта рыхтуюць кадры разнастайнага профілю для педагагічных устаноў нашай краіны.

Кафедра беларускага мовазнаўства забяспечвае вучэбны працэс амаль па 30 дысцыплінах у галіне беларусістыкі, паланістыкі і літуаністыкі. Пры кафедры працуюць кабінет беларускай мовы, кабінет польскай мовы, цэнтр літуаністыкі і камп'ютарны клас, забяспечаныя найноўшай, у тым ліку замежнай, літаратурай, а таксама неабходнай тэхнікай.

Разумеючы, што ў сучасным свеце школьнае навучанне ў цэлым і навучанне філалогіі ў прыватнасці патрабуе перагляду не толькі агульнай метадалогіі, але і канкрэтных прыёмаў працы з падрастаючым пакаленнем, у снежні 2013 г. кафедра прыняла рашэнне адкрыць свой філіял у гімназіі № 7 г. Мінска. Яго дзейнасцю кіруе дацэнт С. Мароз. На працягу навучальнага года выкладчыкі знаёміліся з перадавымі напрацоўкамі настаўнікаў гімназіі і дзяліліся ўласным вопытам па выкладанні мовазнаўчых дысцыплін, забяспечвалі ўдзел гімназістаў у алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры, кансультавалі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па актуальных праблемах лінгвістыкі, праводзілі гутаркі з навучэнцамі гімназіі пра спецыяльнасці, па якіх рыхтуюць на факультэце беларускай і рускай філалогіі БДПУ.

У XXI ст. мадэрнізацыя ўніверсітэцкай адукацыі звязваецца найперш з якасным абнаўленнем яе зместу і арыентацыяй на прыкладныя патрэбы выкладання. У сувязі з гэтым асаблівая ўвага на кафедры надаецца стварэнню ўмоў для развіцця творчага патэнцыялу студэнтаў і паглыбленню іх агульналінгвістычных кампетэнцый. У распрацаваныя стандарты для філолагаў уключаны новыя вучэбныя дысцыпліны,

якія, як падаецца, будуць спрыяць больш якаснай падрыхтоўцы будучых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры: «Беларускае мовазнаўства», «Актуальныя праблемы беларускай мовы», «Стылістыка тэксту», «Беларуская анамастыка», «Метадалогія лінгвістычных даследаванняў», «Беларуская лексікаграфія» і інш. Лекцыйныя і практычныя заняткі па іх праводзяцца выкладчыкамі кафедры.

Узрастанне ролі самастойнай працы студэнтаў у працэсе навучання і інтэнсіўная тэхналагізацыя адукацыі патрабуюць належнага вучэбна-метадычнага забеспячэння. Заслужанай павагай студэнтаў-філолагаў карыстаюцца класічныя падручнікі і дапаможнікі па дысцыплінах, падрыхаваныя беларускімі вучонымі Ф. Янкоўскім, М. Яўневічам, П. Сцяцко, А. Юрэвіч, А. Каўрусам і інш. Сёння выкладчыкі кафедры актыўна працуюць над новым пакаленнем універсітэцкіх падручнікаў. У апошнія гады аўтарскімі калектывамі былі апублікаваны дапаможнікі для студэнтаў «Беларускі правапіс» (2011, 2012), «Беларуская мова. Прафесійная лексіка для педагогаў» (2012), «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» (2013), а таксама дапаможнікі «Стылістыка беларускай мовы» Т. Старасценкі (2014), «Polskidlawszystkich» Г. Пальянавай, І. Пальянавай, А. Барысевіч (2012) і інш. Вядзецца праца па стварэнні аб'ёмнага падручніка па сучаснай беларускай літаратурнай мове для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей.

Высокі патэнцыял выкладчыкаў з'яўляецца вынікам існавання на кафедры шэрагу навуковых школ. Пачынаючы з 1946 г. пры кафедры была адкрыта і паспяхова функцыянуе аспірантура. За апошнія 20 гадоў каля трыццаці яе выпускнікоў пад кіраўніцтвам прафесараў М. Яўневіча, Н. Гаўрош, дацэнта П. Міхайлава паспяхова абаранілі дысертацыйныя даследаванні і сталі кандыдатамі навук. Высокі узровень дысертацый, падрыхтаваных аспірантамі БДПУ, неаднаразова прызнаваўся на дзяржаўным узроўні. Так, кандыдацкая работа выкладчыка кафедры С. Шахоўскай (навуковы кіраўнік дац. П. Міхайлаў), прысвечаная беларускай анамастычнай лексікаграфіі, была прызнана ВАК Беларусі лепшай кандыдацкай работай 2013 г. па гуманітарных дасцыплінах.

Увогуле навуковай дзейнасці надаецца на кафедры прыярытэтная ўвага. Ужо стала добрай традыцыяй рэгулярнае правядзенне міжнародных навуковых канферэнцый пад агульнай назвай «Нацыянальная мова і нацыянальная культура» (2007, 2011, 2013).

Аўтарскімі калектывамі распрацоўваюцца фундаментальныя навуковыя тэмы «Беларуская мова ва ўсходнеславянскай лексікаграфіі: дынаміка метадалагічных падыходаў, тыпалогія формаў, вектары развіцця» і «Нацыянальная мова і мовазнаўства на сучасным этапе: стан, кірункі даследаванняў, перспектывы развіцця».

У межах гэтых і іншых тэм выдадзены шэраг манаграфічных работ: «Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» Ю. Чарнякевіча (2009), «Беларуская матэматычная тэрміналогія: станаўленне, структура, функцыянаванне» Д. Дзятко (2009),

«Глагольные деривационные сочетания в современном польском языке» Г. Пальянавай (2010), «Беларускае мовазнаўства: дысертацыі па беларускай мове, абароненыя ў Рэспубліцы Беларусь (1990–2011 гг.)» Д. Дзятко і С. Шахоўскай (2011), «Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця» С. Шахоўскай (2012), «Тыпалогія эліпсіса ў сінтаксічнай сістэме беларускай мовы» Н. Чайкі (2012), «Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гадоў XX стагоддзя» М. Шабовіча (2013), напісаны раздзел у калектыўнай манаграфіі «Лексикографические штудии» (2014) і інш.

Асноўная праблематыка навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры – функцыянаванне сучаснай беларускай літаратурнай мовы, гісторыя і дыялекталогія беларускай мовы, лексікалогія і лексікаграфія, анамастыка і этналінгвістыка, метадычнае забеспячэнне выкладання беларускай мовы і інш.

Традыцыйна шмат увагі на кафедры надаецца вывучэнню разнастайных праблем лексікалогіі. Так, дацэнт Н. Радзівaноўская на семантычным і структурна-граматычным узроўнях вывучыла айконімы, суадносныя з назвамі расліннага свету. У даследаваннях дац. П. Міхайлава ўстаноўлены спосабы ўтварэння беларускіх тэрмінаў ганчарства, прасочаны шляхі і спосабы пранікнення запазычаных слоў, дадзена характарыстыка геаграфіі ганчарскай лексікі і вызначаны арэальныя сувязі слоў. Выяўленню прычын і спосабаў аказіянальных слоў у беларускіх мастацкіх тэкстах 1920-х гг. прысвечаны працы дац. М. Шабовіча. На структурна-граматычным, словаўтваральным і семантычным узроўнях былі вывучаны асаблівасці беларускай матэматычнай тэрміналогіі (дац. Д. Дзятко).

Нямала зроблена ў галіне граматыкі беларускай мовы. Дацэнт В. Урбан прааналізавала і апісала словаўтваральную сістэму ацэначных дэрыватаў у беларускай дыялектнай мове. Граматычная і семантычная структура эліптычных сказаў, іх камунікатыўныя і стылістычныя функцыі ў творах мастацкай літаратуры вывучыла дацэнт Н. Чайка. Сістэмны структурна-семантычны аналіз сінтаксічных канструкцый, што перадаюць семантыку пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, праведзены ў працах дацэнта С. Мароз.

Важнымі і актуальнымі для беларускай лінгвістыкі застаюцца пытанні стылістыкі і мовы мастацкай літаратуры. У даследаваннях дацэнта Т. Старасценкі зроблены аналіз лексіка-стылістычных сродкаў рэалізацыі кантрасту ў мове паэтычных твораў. Шляхам аналізу семантычных і функцыянальна-стылістычных асаблівасцей дацэнта Н. Лобань даследавала лексіку са значэннем канатацыі ў мастацкіх творах. У працах дацэнта Н. Нямковіч паказаны лінгвістычныя асаблівасці тэкстаў розных жанраў у творчасці Ядвігіна Ш. і сістэматызаваны мастацкія сродкі, прыёмы, тропы, выкарыстаныя аўтарам.

Кандыдат педагагічных навук У. Саўко шмат гадоў займаецца праблемамі лінгваметодыкі. Ён на аснове аналізу лінгвістычнай, метадычнай, псіхолага-педагагічнай літаратуры, а таксама вынікаў канстатуючага эксперыменту распра-

цавау навукова абгрунтаваную методыку развіцця мовы школьнікау пры вывучэнні марфалогіі, якая прадугледжвае глыбокае асэнсаванне граматычных з'яу, засваенне нормау беларускай літаратурнай мовы, узбагачэнне слоунікавага запасу вучняу, фарміраванне уменняу і навыкау звязнага вуснага і пісьмовага маулення.

На падставе выкананых кваліфікацыйных даследаванняу выкладчыкі кафедры займаюцца распрацоукай новых кірункау і праводзяць унікальныя даследаванні, якім няма аналагау у нашай краіне. Сярод прыярытэтных напрамкау – акцэнталогія і дыялектная лексікаграфія (П. Міхайлау), гісторыя мовазнауства (П. Міхаилау, Д. Дзятко), камп'ютарная і гендарная лінгвістыка (Н. Радзіваноуская), дэрываталогія (М. Шабовіч, В. Урбан), тэорыя канатацыі (Н. Лобань), метадалогія тэрмінаграфіі (Д. Дзятко), актуальныя пытанні сучаснай граматыкі (С. Мароз, Н. Чайка), перакладазнауства і мова мастацкай літаратуры (Н. Нямковіч, М. Ржавуцкая), разнастайныя праблемы лінгвадыдактыкі (У. Сауко) і інш.

Факультэт беларускай і рускай філалогіі сёння – гэта вядучы цэнтр па падрыхтоуцы высокакваліфікаваных спецыялістау-філолагау. Факультэт расце, сталее, замацоувае свой міжнародны аутарытэт, таму мы глядзім у яго будучыню з надзеяй і упэуненасцю.

## ПРОСТРАНСТВО МИФА О ВОЛХВАХ В КОНТЕКСТЕ РОМАНА М. ТУРНЬЕ «КАСПАР, МЕЛЬХИОР И БАЛЬТАЗАР»

*А.И. Завадская, БГПУ (Минск)*

В основу романа знаменитого французского мифотворца М. Турнье «Каспар, Мельхиор и Бальтазар» положен скромный по своим масштабам эпизод из евангелия от Матфея, повествующий о поклонении трех волхвов родившемуся Спасителю. На протяжении столетий он «обрастал» небылицами, деталями и фактами, прочно заняв нишу мифа в апокрифической и не только литературе.

Трем языческим царям выпадает честь отдать должное младенцу Иисусу, явившемуся в мир. Изначально волхвы никак не именовались, лишь в восьмом столетии историк Церкви Иоаков из Варацце дал им имена Каспара, Мельхиора и Бальтазара (на русский манер Валтасара, хотя в ранних рукописях он называется Вифисарей). Греческие варианты имен: Аппелликон, Америн и Дамаскон, еврейские: Магалат, Галгалат и Серакин, у Оригена волхвов звали Авимелех, Охозат, Фикол. Также неизвестно, было ли их в точности трое, но, поскольку в евангелии упоминается о трех дарах: золоте, ладане и смирне, которые были поднесены Спасителю, то принято считать количество волхвов по количеству даров, хотя по некоторым источникам мудрецов могло быть значительно больше. Апокрифические предания упоминают имя четвертого волхва – Артабан, в романе М. Турнье он называется Таор.